– проблемно-поисковые (субъективно моделируют процесс ______ ________________________________ __на основании существующих образцов – открытий, изобретений, шедевров);

– творческие (включают учащихся в процесс _____________ в сфере исследовательской, изобретательской или художественно-творческой деятельности).

| |
|---|
| Приведите примеры репродуктивных, проблемно-поисковых и творческих методов из практики преподавания в школе общеобразовательных предметов и курса “Искусство”. |

***Задание для самостоятельной работы.*** *В течение ближайшей учебной недели проанализируйте методику обучения по вашей специальности в один из дней по первому варианту классификации, в другой – по второму, в третий – по третьему варианту классификации. Выберите наиболее удобный и информативный вариант классификации и объясните свой выбор.*

В таком случае работа над конспектом позволяет избежать непродуктивного, механического записывания и одновременно стимулирует познавательную деятельность студентов как на лекции, так и после ее.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дзіцэвіч Л.М.,** *ст.выкладчык*

## ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ НАСТАЎНІКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

У любой краіне якасць жыцця залежыць ад разумовых здольнасцей, уменняў, выхавання, культурнага ўзроўню людзей. У выхаванні чалавека галоўная роля належыць настаўніку. Таму ў высокаразвітых краінах вялікую ўвагу надаюць адукацыі і фарміраванню асобы настаўніка.

Студэнты чацвёртага курса ФБІС БДУ культуры пад кіраўніцтвам аўтара гэтага артыкула на працягу 2000/01 навучальнага года займаліся тэарэтычным аналізам вобраза сучаснага настаўніка, праводзячы параўнальны аналіз вобраза ідэалізаванага настаўніка з вобразамі настаўнікаў роднай мовы і літаратуры тых школ, якія закончылі студэнты. Даследаванне ахоплівала ўсе бакі дзейнасці настаўніка і спрыяла лепшаму разуменню ролі сучаснага настаўніка і яго ўплыву на маладое пакаленне.

Трэба адзначыць неабходнасць валодання настаўнікам асновамі педагогікі і псіхалогіі, ведання псіхалагічных, узроставых, індывідуальных асаблівасцей дзяцей. Гэтыя веды патрэбныя для ўстанаўлення станоўчых ўзаемаадносін настаўніка з вучнямі ў класе і ў пазаўрочны час. Як адзначылі студэнты, настаўнікі не заўсёды ў належнай ступені валодаюць названымі ведамі. У значнай ступені гэта тлумачыцца спецыфікай навучання ў савецкай школе, дзе пераважалі аўтарытарныя метады. Гэтыя метады на дазваляюць настаўніку:

а) весці гутарку з вучнямі «на роўных» на аснове педагогікі супрацоўніцтва;

б) весці сапраўдную спрэчку, у якой нараджаецца ісціна;

в) адказваць на шматаспектныя пытанні вучняў, ініцыяваць гэтыя пытанні, нават ставіць адзнакі не толькі за адказ, але і за пытанне (сёння гэта адна з праблемных сфер адукацыі і патрабуе глыбокага даследавання).

Найважнейшай рысай асобы настаўніка з'яўляецца яго прафесійнасць: валоданне методыкай выкладання, веданне прадмета, прымяненне новага ў навуцы, уменне вучыцца навучаючы, уменне зацікавіць прадметам. Як вызначылі студэнты, прафесійнасць сучаснага настаўніка нязначная, нязначна перавышае сярэдні ўзровень. Найчасцей на ўроках выкарыстоўваюцца рэпрадуктыўны метад навучання тыпу "чытайце параграф", а таксама кімсьці трапна названы "мелавы" метад. Наглядна-ілюстрацыйны, даследчы, пошукавы і іншыя метады выкарыстоўваюцца галоўным чынам на «адкрытых» уроках. Улічваючы

разнабой у правапісе, змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны за апошнія дзесяць гадоў, якія паўплывалі на знешнюю і ўнутраную гісторыю роднай мовы беларусаў, адсутнасць грашовых сродкаў на набыццё літаратуры, прафесійных газет і часопісаў, прымяненне новых дасягненняў методыкі выкладання мовазнаўства, літаратуразнаўства застаецца па-за штодзённай працай настаўніка.

Ва ўмовах звужэння сферы ўжытку беларускай мовы асоба трэба звярнуць увагу на працу настаўніка па зацікаўленні вучняў прадметам роднай мовы і літаратуры. Як настаўнік сярэдняй школы з 20-гадовым стажам, мушу прызнаць, што, нягледзячы на шырокую ўрочную і пазакласную работу настаўнікаў у гэтым кірунку, у школе, як сведчаць вынікі нашых апытанняў студэнтаў, даследаванні студэнтаў БДУ культуры, ЕГУ і іншых ВНУ, маюць месца не беларусізацыя, не цікавасць да роднай мовы, а адваротныя працэсы. Сярод 300 апытаных намі студэнтаў па прычынах невыкарыстання беларускай мовы ў маўленні 200 рэпрэзентантаў назвалі сярод іншых прычын недасканалы ўзровень навучання беларускай мове ў школе, у якой яны не набылі ўменне карыстацца вуснай мовай. Адзначылі яны і адсутнасць пачуцця павагі і любві да яе, гонару за яе мілагучнасць, прэстыжнасць, неабходнасць, зручнасць і інш. Пачуцці, якія ідэнтыфікуюць беларусаў, студэнты ў сваім школьным мінулым мусілі набываць з прэсы, літаратуры, у коле сяброў, у асяродку шматлікіх грамадскіх арганізацый. Асноўным прыкладам "адвароту" ад мовы яны лічаць пераход настаўнікаў-беларусазнаўцаў на рускую мову адразу пасля заканчэння ўрока. Так выхоўваецца непавага да роднай мовы.

Мэтазгодна вылучыць такія аспекты прафесіі настаўніка, як патрабавальнасць і аб'ектыўнасць у захаванні нормаў выстаўлення адзнак. Сёння настаўнік павінен не толькі ведаць і захоўваць гэтыя нормы, але і перадаць веданне сваім вучням. У гэтых адносінах нашы шматгадовыя назіранні, выказванні студэнтаў не даюць падстаў да заспакаення. Сярод ста студэнтаў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

першакурснікаў, з якімі нам давялося працаваць, толькі 10% ведаюць нормы выстаўлення адзнак.

Складаючыя вобраза высокапрафесійнага настаўніка шматбаковыя і шматузроўневыя, і дасягнуць іх адразу немагчыма, аднак калі ўжо сёння студэнт-практыкант ці малады спецыяліст будзе ставіць мэты па авалоданні імі, у будучым Беларусь атрымае высокападрыхтаваных спецыялістаў-настаўнікаў, якія змогуць уплываць на жыццё нашай краіны.

**Л.А.Дзямешка,** *прафесар*
**Н.У.Клімянкова,** *дацэнт*
**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

## САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ КУРСА «АБСЛУГОЎВАННЕ ЧЫТАЧОЎ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навучанне ў ВНУ дае будучаму бібліятэкару фундаментальную агульнаадукацыйную і прафесійную падрыхтоўку. Удасканаленне прафесійнага навучання спецыялістаў патрабуе эфектыўнай педагагічнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі, якая забяспечвае набыццё імі ведаў, навыкаў і ўменняў з улікам задач бібліятэчнай практыкі.

Працэс навучання прадугледжвае дзве часткі – базавую і рэцэптурную. Першая ўключае фундаментальныя веды, другая накіравана на выкананне функцый канкрэтнай дзейнасці. Заўважым, што без інтэграцыі спецыяльных дысцыплін з дысцыплінамі агульнаадукацыйнага блока немагчыма падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Курс «Абслугоўванне чытачоў» прадугледжвае вывучэнне студэнтамі тэарэтычных асноў (праблем сацыялогіі, псіхалогіі чытання, тэорыі абслугоўвання і інш.). Акрамя гэтага, задачы прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў – абслугоўванне кары-